# Навінкі кнігавыдання




**У выдавецтве «ЮрСаПрынт» выйшла новая кніга для дзяцей Ганны Скаржынскай-Савіцкай "Сёма і Адзінка".**

Як паведамляецца ў анатацыі, у кнігу ўвайшлі цікавыя казкі на розныя тэмы, пазнавальныя і павучальныя апавяданні, многія з якіх адлюстроўваюць асаблівасці школьнага жыцця, вучаць сціпласці і выхаванасці, беражлівым адносінам да прыроды.
Пісьменніца раскрывае ўнутраны свет сваіх герояў, псіхалогію дзяцей падрастковага ўзросту.

Казкі адрасаваны дзецям малодшага школьнага ўзросту. Маленькаму чытачу будзе цікава даведацца, як утвараецца вясёлка, што дорыць людзям сонейка акрамя цяпла, святла, добрага настрою. Казка "Сёма і Адзінка" раскажа, як адзнака адзінка можа стаць "каралевай дзённіка" – дзясяткай. Разам з героямі казачных твораў дзеці будуць вандраваць па старонках кнігі – перажываць, смяяцца, захапляцца.

Раздзел апавяданняў пачынаецца з твораў, якія пісьменніца прысвяціла знакамітым людзям Шчучыншчыны (малой радзімы аўтара). У пазнавальных, павучальных апавяданнях дзеці даведаюцца як аказаць першую дапамогу ў тым ці іншым няшчасным выпадку, які можа здарыцца ў жыцці. Пра шкоднасць на арганізм чыпсаў, кірыешак, ролтана раскажа апавяданне "Алергія". Карысна будзе пачытаць апавяданні, якія вучаць любіць родную мову, кнігу, Радзіму.

У кнізе "Сёма і Адзінка" юны чытач знойдзе эсэ пра беларускую прыроду. Аўтар захапляльна, красамоўна, з ужываннем эпітэтаў і параўнанняў апісвае свае назіранні ў прыродзе, яе непаўторную прыгажосць у кожную пару года.

Яркія каляровыя ілюстрацыі да кнігі пісьменніца выканала сама.

Выдавец і паліграфічнае выкананне – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЮрСаПрынт» (Гродна). У хуткім часе новая, 16-я кніга Ганны Скаржынскай-Савіцкай «Сёма і Адзінка» з'явіцца ў бібліятэках і гандлёвай сетцы.

ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА